**947.6«1741»+347.97/.99 (476)(091)«1741»**

# БАРАЦЬБА МАГНАЦКІХ ГРУПОВАК ВАКОЛ ТРЫБУНАЛА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1741 ГОДА

***канд. гіст. навук А.У. МАЦУК***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Даследуюцца прычыны барацьбы магнацкіх груповак вакол Трыбунала Вялікага княства Літоўскага 1741 года. Дэталёва разглядаюцца склад магнацкіх груповак і ход барацьбы паміж імі. Даказана, што перамога Сапег над Радзівіламі ў кантролі над Трыбуналам ВКЛ 1741 года была атрымана толькі дзякуючы падтрымцы каралеўскага двара, якая была аказана па просьбе Чартарыйскіх. Гэтая перамога кааліцыі родаў Чартарыйскіх, Сапег, Салагубаў і Масальскіх перашкодзіла ўсталяванню дамінавання магнацкай групоўкі Радзівілаў ва ўнутрыпалітычным жыцці Вялікага княства Літоўскага.*

**Уводзіны.** У пачатку 40-х гадоў XVIII стагоддзя ва ўнутрыпалітычным становішчы Вялікага княства Літоўскага дамініравала магнацкая групоўка Радзівілаў і іх родзічаў вялікага гетмана ВКЛ і віленскага ваяводы Міхала Вішнявецкага (жанаты на Тэклі з Радзівілаў) і канцлера ВКЛ Яна Фрэдэрыка Сапегі (жанаты на Канстанцыі Радзівіл). Апошні паходзіў з коданьскай галіны Сапег і падтрымліваў сваіх родзічаў Радзівілаў супраць «чарэйскай» галіны роду Сапег. Апошнія (лоўчы ВКЛ Міхал Антоні Сапега і віленскі каад'ютар Юзаф Станіслаў Сапега) у кааліцыі з падскарбіям ВКЛ Янам Салагубам, мсціслаўскім ваяводай Міхалам Масальскім і падканцлерам ВКЛ Міхалам Чартарыйскім з 1738 года змагаліся з Радзівіламі за палітычнае вяршэнства ў княстве. У гэтай барацьбе асаблівае значэнне мела тое, хто з магнацкіх груповак будзе мець кантроль над Трыбуналам ВКЛ.

**Асноўная частка.** Маёмасныя супярэчнасці сталі прычынай канфлікту Сапег і Радзівілаў у 40-х гадах XVIII стагоддзя. Як трапна заўважыла Тэрэза Зялінская, у XVIII стагоддзі «маёмасныя справы перапляталіся амаль неразрыўна з палітычнымі. Барацьба за кожны кавалачак маёмасці была толькі адной з праяваў барацьбы паміж магнацкімі родамі аб даходах, удзелу ва ўладзе, гонарах, у якой рэдка выступаў адзін з гэтых элементаў у адрыве ад астатніх» [1, s. 187]. У Вялікім княстве Літоўскім адразу некалькі спрэчных судовых спраў павінны былі значна паменшыць ці павялічыць уладанні некаторых магнацкіх родаў і сталі прычынай палітычнага канфлікту паміж імі. Гэтыя справы разглядаліся ў Трыбунале ВКЛ. Менавіта таму асноўная барацьба паміж магнацкімі родамі праходзіла вакол трыбунальскіх урадаў. Пасада маршалка Трыбунала ВКЛ была больш важнай, чым у Каронным Трыбунале, бо ад трыбунальскага маршалка ВКЛ залежаў як тэрмін, так і ход працэса. Акрамя таго, пасада пісара давала магчымасць уплываць на змест дэкрэтаў [2, s. 51]. Такім чынам, асаблівую важкасць набывала тое, прадстаўнікі якіх магнацкіх груповак атрымлівалі гэтыя ўрады. Большасць была патрэбна і пры прыняцці судовых рашэнняў. Гэта рабіла грамнічныя соймікі, на якіх адбываліся выбары ў Трыбунал ВКЛ, арэнай палітычнай барацьбы паміж рознымі магнацкімі групоўкамі. У выніку значная колькасць соймікаў зрывалася, а супраць некаторых заносіліся пратэстацыі, што рабіла вельмі важкім рэасумпцыю Трыбунала, дзе адбывалася ўвядзенне абраных дэпутатаў у лік суддзяў. Найбольш прыдатна ў такой сітуацыі адчувалі сябе Чартарыйскія. Яны як род, які нядаўна ўзвысіўся ў грамадска-палітычным жыцці княства, не былі звязаны роднаснымі сувязямі з іншымі магнацкімі родамі, што прадстаўлялі палітычную эліту ВКЛ, і таму не мелі значных судовых спраў. Гэта давала ім магчымасць разглядаць выбары ў Трыбунал, як палітычны інструмент, і Міхал Чартарыйскі: «характар урадаў чыніў з кожнагадовага складу Трыбунала ВКЛ» [3, s. 46]. Чартарыйскія даволі ўдала выкарыстылі склаўшуюся палітычную кан'юктуру ў ВКЛ і падтрымалі Сапегаў у іх канфлікце з Радзівіламі, які разгарэўся з-за пытання спадчыны па памерлым 30 траўня 1738 года Казіміру Леону Сапезе. Да гэтага канфлікту далучыўся і канфлікт аб спадчыне па памерлым 16 траўня 1739 года троцкім кашталяне Антоніі Казіміры Сапезе. Ужо 1739 – 1740 гады прайшлі ў барацьбе паміж магнацкай кааліцыяй і Радзівіламі. У такой сітуацыі барацьба паміж магнацкімі групоўкамі вакол Трыбунала ВКЛ 1741 года павінна была паказаць, на чыім баку знаходзіцца перавага ў княстве: кааліцыі Сапег, Чартарыйскіх, Салагубаў і Масальскіх ці Радзівілаў і іх родзічаў.

Апошняй спробай скончыць канфлікт і прымірыцца былі перамовы паміж Сапегамі і Радзівіламі пасля сойма 1740 года. Яны пачаліся адразу пасля сканчэння гэтага сойма пры пасрэдніцтве канцлера ВКЛ Яна Фрэдырка Сапегі. Перамовы праходзілі паміж бускімі старастамі Ябланоўскімі і Юзафам Станіслававам Сапегай. Віленскі каад'ютар за прызнанне яму Каралінай Ябланоўскай апекі над непаўналетнімі Аляксандрам і Міхалам Ксаверыям Сапегамі пагаджаўся выплаціць чатырыста тысяч злотых, воўпенскую суму і аплаціць восемьдзесят тысяч злотых доўгу на Анікштах, а таксама выплаціць іншыя асноўныя даўгі памерлага Казіміра Леона і яго жонкі. У сваю чаргу тая (ужо буская старасцянка Караліна Ябланоўская) абяцала, што воўпенскае староства ў будучым дастанецца аднаму з яе сыноў Аляксандру ці Міхалу Ксаверыю,

а потым нават стала схіляцца да думкі аддаць сваім дзецям сто тысяч злотых, якія былі вызначаны за рухомую маёсць. Не адмаўлялася Караліна Ябланоўская і ад прапановы, каб у будучым ракацішскае і лаварышскае староства ў будучым таксама дасталіся яе дзецям Аляксандру і Міхалу Ксаверыю. І калі здавалася, што Сапегі і Ябланоўскія заключаць дамову, то Караліна нечакана перадумала і стала зацягваць час. Больш таго, пры дапамозе каралевы Марыі Юзэфы паспрабавала прымусіць Сапег саступіць, але віленскаму каад'ютару ўдалося пераканаць тую ў невіноўнасці Сапег. У выніку каралева перастала ўмешвацца ў канфлікт паміж Радзівіламі і Сапегамі і заняла нейтральнае становішча [4, k. 333 – 335].

Муж Караліны бускі стараста Юзаф Ябланоўскі ў сваю чаргу адмовіўся, каб пасрэднікам у перамовах быў Ян Фрэдэрык Сапега і пры пасрэдніцтве Яна Тарлы і Юзафа Сцыпіона прапанаваў Сапегам новы варыянт дамовы. Прычынай перамен быў ад'езд з Варшавы польнага гетмана Міхал Казімір Радзівіла, які пільнаваў інтарэсы Радзівілаў у перамовах Сапег і Ябланоўскіх. Ян Фрэдэрык Сапега стаў больш спрыяльна адносіцца да Сапег. Новы план Ябланоўскага заключаўся ў выплаце Сапегамі на працягу чатырох тыдняў трыста тысяч злотых і згоды, каб пасля выплаты даўгоў са староствaў Караліна магла перадаць іх згодна сваім меркаванням. У такім выпадку з найбольшай верагоднасцю іх уладальнікам і стаўбы яе муж Юзаф Ябланоўскі. Зразумела, што такая дамова не задавальняла Радзівілаў, якія ў будучым гублялі ўсе правы на ўладанні Караліны. Гэта прымусіла іх хутка дзейнічаць. Ганна Радзівіл сваімі лістамі з Бялай і праз свайго сакратара паабяцала Ябланоўскім дапамогу супраць Сапегаў у Трыбунале ВКЛ і такім чынам здолела пераканаць Юзафа Ябланоўскага адмовіцца ад дамовы [4, k. 335 – 336].

Пасля зрыву дамовы з бускімі старастамі ў Варшаве Юзаф Сапега не бачыў іншага выхаду, каб выйграць з імі судовую справу ў Трыбунале ВКЛ. На яго погляд, Сапегі лёгка атрымаюць перамогу над Радзівіламі. Садзейнічаць гэтаму павінен быў разлад у пазіцыях лідэраў Радзівілаў. Міхал Казімір Радзівіл увесь час займаўся сваімі справамі ў Кароне. Міхал Вішнявецкі ўвогуле абяцаў Яну Фрэдэрыку Сапезе, што не будзе ўмешвацца ў спрэчку Сапегаў з бускімі старастамі. Мікалай Фаўстын Радзівіл мала што мог зрабіць у Трыбунале ВКЛ. Ганна Радзівіл, на думку Юзафа Станіслава Сапегі, «так мала магла ў Трыбуналах на працягу чатырох гадоў, што свае інтарэсы кіравала – маім крэдытам» [4, k. 336].

Дапамагала Сапегам і пазіцыя каралеўскага двара. Аўгуст ІІІ пасля сканчэння сойма хутка выехаў у Саксонію, каб больш пільна заняцца справай «аўстрыйскай спадчыны». Каралева засталася ў Варшаве і прасіла магнатаў перашкаджаць магчымаму стварэнню антыкаралеўскай канфедэрацыі ў Рэчы Паспалітай. Вельмі ўдала з такой сітуацыі скарысталіся Сапегі і Чартарыйскія. Апошнія пастараліся на каралеўскім двары аб падтрымцы кандыдытуры Міхала Масальскага на маршалка будучага Трыбунала ВКЛ. У выніку Аўгуст ІІІ прасіў мсціслаўскага ваяводу старацца аб трыбунальскае маршалкоўства, каб «праз гэта ўтрымаць спакой у Літве» [4, k. 332].

Саюзнікамі Сапег у барацьбе супраць Радзівілаў сталі іншыя ўдзельнікі кааліцыі. Найперш, Сапегі лічылі неабходным заручыцца падтрымкай Чартарыйскіх. Міхал Антоні Сапега палічыў за лепшае нават паехаць да Воўчына, каб абмеркаваць планы з Міхалам Чартарыйскім. Потым разам з усім сямействам Міхала Чартарыйскага ён накіраваўся да Аўгуста Чартарыйскага ў Медзірэчча. Туды ж прыбылі з Варшавы і іншыя Чартарыйскія: познаньскі біскуп Тэадор і харужыч ВКЛ Станіслаў. Чартарыйскія абяцалі і ў далейшым дапамагаць інтарэсам Сапегі на каралеўскім двары. Куды складаней было ўзгадніць планы адносна будучага Трыбунала ВКЛ, бо Міхал Антоні Сапега не мог прыняць рашэнні без згоды астатніх удзельнікаў кааліцыі. У выніку Чартарыйскія пагадзіліся з супольным планам, асабліва ў пункце, што ніводны з Агінскіх не павінен быў стаць трыбунальскім маршалкам [5, p. 403 – 403v].

Супольны план выбараў на будучы Трыбунал ВКЛ быў складзены на сустрэчы каля Шчучына ў пачатку 1741 года паміж Міхала Антоніям і Юзафам Станіславам Сапегамі, Міхалам Масальскім і Янам Салагубам. На гэтай жа сустрэчы і было прынята канчатковае рашэнне, што кандыдатам магнацкай кааліцыі на трыбунальскае маршалкоўства будзе мсціслаўскі ваявода Міхал Масальскі [4, k. 338]. Той у канцы студзеня 1741 года яшчэ раз пацвердзіў сваю вернасць плану кааліцыі з Сапегамі і Салагубам і зноў абяцаў старацца стаць трыбунальскім маршалкам [6, p. 15].

Іншы ўдзельнік кааліцыі падскарбі ВКЛ Ян Салагуб у сярэдзіне студзеня 1741 года пацвердзіў Сапегам, што падтрымае іх у судовых справах у Трыбунале. Адначасова прасіў дапамогі Сапег у Трыбунале ВКЛ для абознага княства Ігната Агінскага [5, p. 409 – 409v]. Абозны быў зацікаўлены ў дапамозе Сапег на рускай кадэнцыі Трыбунала ВКЛ. Менавіта таму, у адрозненні ад іншых Агінскіх падчас трыбунальскай кампаніі 1741 года падтрымаў не Радзівілаў, а Сапег. Ён паведаміў Сапегам, што Мікалай Фаўстын Радзівіл даў шляхціцу Есману 200 талераў для зрыву гарадзенскага сойміка. Дапамагаў Агінскі і прыхільніку Сапег – ваўкавыскаму гродскаму пісару Дамініку Сухадольскаму, які стараўся стаць дэпутатам на мазырскім сойміку. Ігнат Агінскі ў яго падтрымку напісаў да мазырскага гродскага старасты Гервазія Людвіка Аскеркі. Мазырскі гродскі стараста і яго брат мазырскі маршалак Рафал Аскерка павінны былі дапамагчы, бо апошні як раз «стараўся аб руцэ» сястры Ігната Агінскага Станіславы Тэрэзы [5, p. 410 – 412]. Потым па невядомым прычынам адбыліся перамены ў пачатковым плане, і ваўкавыскі

гродскі пісар Дамінік Сухадольскі для дапамогі быў дасланы на экзулянцкія соймікі [5, р. 418]. Гэта перамена планаў кааліцыі не парушыла яе супрацоўніцтва з Ігнатам Агінскім, які абяцаў кааліцыянтам дапамогу ў зрыве небяспечнага браслаўскага сойміка [5, р. 411v].

Сярод удзельнікаў кааліцыі былі падзелены і іншыя соймікі. Найбольшы цяжар прыпаў на саміх Сапег. За тры соймікі ў Вільні адказваў Юзаф Станіслаў Сапега. На віленскі соймік у дапамогу яму лоўчы ВКЛ даслаў шляхціца Задарноўскага [5, р. 415]. Дапамагаць віленскаму каад'ютару ад Фаміліі павінен быў віленскі падчашы Ян Гараін [7, k. 88]. Міхал Антоні Сапега прасіў брата пастарацца, каб на смаленскім ці старадубскім сойміку быў абраны дэпутатам Стравінскі [5, р. 417]. Сам Міхал Антоні Сапега імкнуўся забяспечыць выбар прыхільных дэпутатаў на слонімскім сойміку [5, р. 411]. Лоўчы ВКЛ лічыў, што лепей усяго сарваць і «незрываемы» ковенскі соймік. Гэта было вельмі складана зрабіць, таму Міхал Антоні Сапега прасіў свайго прыхільніка Скарульскага старацца стаць дэпутатам разам з Мядэкшай. Калі і гэта не атрымаецца, то ўсё ж такі пастарацца сарваць соймік [5, р. 411]. Лоўчы ВКЛ падрыхтаваў і зрыў упіцкага сойміка [5, р. 411]. Наваградскі соймік павінен быў сарваць вількаўскі стараста Юры Феліцыян Сапега [5, р. 414v]. Вялікая ўвага надавалася Сапегам «рускім» соймікам. Прычына заключалася, напэўна, у канфлікце з уплывовымі на гэтых сойміках Агінскімі па выплаце грошай за іх правы на «нойбургскія ўладанні». Агінскія ў большасці падтрымалі Радзівілаў і нават не выключалася, што адзін з іх паспрабуе стаць дэпутатам і надалей трыбунальскім маршалкам, таму «рускія» соймікі павінен быў пільнаваць адзін з сапежынскіх шляхецкіх лідэраў ашмянскі стражнік Францішак Ракіцкі. Міхал Антоні Сапега загадаў яму, каб былі сарваны найбольш небяспечныя віцебскі і рэчыцкі соймікі. На апошні лоўчы ВКЛ нават даслаў свайго прыхільніка Бухавецкага. На сойміку ў Оршы збіраўся прысутнічаць сам Ракіцкі [5, р. 415]. Значную дапамогу Сапегам аказвала Фамілія. Міхал Чартарыйскі абяцаў сваю падтрымку Сапегам на ковенскім і ўпіцкім сойміках. Прызываў Сапег не зрываць ковенскага сойміка, бо найбольшыя шанцы стаць дэпутатамі маюць прыхільнік падскарбія ВКЛ шырвінскі стараста Міхал Эперыяш і Ізідор Кжыўкоўскі. Апошні хоць і быў таварышам у харугве падчашага ВКЛ Геранiма Фларыяна Радзівіла, але выхоўваўся на двары ў Станіслава Панятоўскага і быў адданы інтарэсам Фаміліі. У сваю чаргу прыхільнік Фаміліі Сымон Сіруць абяцаў не старацца аб дэпутацтва, каб соймік не быў сарваны. На ўпіцкім сойміку Чартарыйскі абяцаў, што яго прыхільнік Гротуз не дапусціць выбара ні Страшэвіча, ні Сташэўскага. Такія ж загады даў Міхал Чартарыйскі і сваім іншым прыхільнікам у гэтым павеце. Адначасова Міхал Чартарыйскі не разлічваў, што яго загад паслухае шляхціц Булгак і сарве віцебскі соймік. Удалося Чартарыйскаму пераканаць Сулістроўскага* не старацца стаць дэпутатам і прэтэндаваць на трыбунальскае маршалкоўства [8, р. 8 – 8v]. Падрыхтоўка кааліцыянтаў не аказалася па за ўвагай Радзівілаў. Так, Барбара Радзівіл, пабачыўшы падрыхтоўку кааліцыі, нават пераканаўча заяўляла, што «яны ўжо паўсюль маюць сваіх прадстаўнікоў на сойміках» [7, k. 88].

У сваю чаргу Сапегі вельмі апасаліся, што хтосьці з Радзівілаў будзе імкнуцца стаць трыбунальскім маршалкам, таму не было нічога дзіўнага, што яны ўважліва адносіліся да чутак на гэты конт. Міхал Антоні Сапега нават у сваім лісце ад 21 студзеня 1741 года інфармаваў Юзафа Францішка Сапегу, што мае дакладную навіну, што наваградскі ваявода Мікалай Фаўстын Радзівіл думае быць абраным дэпутатам і сына (напэўна рэчыцкага гродскага старасту Альбрэхта – *А.М.*) хоча з рэчыцкага сойміка выбраць дэпутатам і «іншых суб'ектаў па розных ваяводствах і паветах хоча ўтрымаць» [9, k. 185 – 186].

Неадназначную пазіцыю займаў канцлер ВКЛ Ян Фрэдэрык Сапега. Звязаны з Радзівіламі, ён, аднак, прыхільна ставіўся да планаў Сапег. Сам затрымліваўся ў Варшаве і таму прасіў Юзафа Станіслава Сапегу самастойна старацца аб выбары прыхільных дэпутатаў на брэсцкім сойміку [5, р. 494]. Сам Міхал Антоні Сапега быў упэўнены, што брэсцкі соймік будзе сарваны ці на ім будуць абраныя прыхільнікі Сапегаў [5, р. 415]. Акрамя таго, Ян Фрэдэрык Сапега перадаваў чуткі, што Масальскі імкнуўся быць абраным дэпутатам на ковенскім сойміку. Лічыў, што той дапаможа Сапегам у іх справе, але з'яўляецца прыхільнікам Чартарыйскіх. Да апошніх адносіўся непрыхільна і абвінавачваў іх, што яны напісалі да брэсцкага харужага Феліцыяна Верашчакі, каб на брэсцкім сойміку стараўся правесці выбар толькі прыхільнікаў Фаміліі і ні ў якім выпадку прыхільнікаў Радзівілаў ці Сапег [5, р. 497]. Фактычна пазіцыя Яна Фрэдэрыка Сапегі заключалася толькі ў падтрымцы Масальскага як кааліцыянта Сапег. Яго некаторыя сумненні адносна кандыдатуры Масальскага былі выкліканы не пазіцыяй Радзівілаў, а канфліктам самога канцлера ВКЛ з падканцлерам ВКЛ Міхалам Чартарыйскім.

Радзівілы аказаліся не падрыхтаваны да супрацьстаяння такой узгодненай кааліцыі. Асабліва перашкаджаў ім канфлікт унутры рода. Толькі ў пачатку лютага 1741 года Ганне Радзівіл нарэшце ўдалося скончыць перамовамі справу з наваградскімі ваяводамі, што давала магчымасць Радзівілам аб'яднаць свае сілы [10, k. 133]. Другой праблемай была занятасць Міхала Казіміра Радзівіла справамі спадчыны па Сабескіх, што прымушала яго амаль увесь час знаходзіцца ў Кароне. І гэта пры тым, што на яго дапамогу

* Напэўна, Антоні Сулістроўскі.

найбольш разлічвалі астатнія Радзівілы. Наваградская ваевадзянка Барбара Радзівіл няўдала імкнулася даведацца аб планах кааліцыі і прасіла Міхала Казіміра Радзівіла як мага хутчэй вярнуцца ў ВКЛ «бо ўвесь час з'езды і канферэнцыі паміж Ягомосьць Панамі Сапегамі, Салагубам, Масальскім. Перамовы такія сакрэтныя, што ніводнага чалавека з сабой не мелі ў Шчучыне, толькі сваіх памочнікаў» [7, k. 87].

Галоўнай праблемай Радзівілаў было тое, што яны не мелі ўзгодненага кандыдата на трыбунальскае маршалкоўства. Напярэдадні грамнічых соймікаў віцебскі ваявода Марцін Агінскі звярнуўся да Ганны Радзівіл з просьбай, каб Радзівілы падтрымалі кандыдатуру яго сына віцебскага кашталяна Станіслава на трыбунальскае маршалкоўства. Ганна Радзівіл пасля пэўных разваг вырашыла «лепей таго ўтрымаць ці каго іншага» [10, k. 124 – 125]. Агінскія, праўда, даволі хутка адмовіліся ад прэтэнзій на трыбунальскае маршалкоўства. Міхал Чартарыйскі ведаў чуткі, што Радзівілы разам з надворным падскарбіям ВКЛ Юзафам Францішкам Сапегай мяркуюць абраць трыбунальскім маршалкам вількамірскага гродскага старасту Бенедыкта Тызенгаўза [8, p. 8v]. Радзівіламі жа разглядаліся іншыя кандыдаты. Яну Салагубу падчас побыту ў віленскага ваяводы Міхала Вішнявецкага ўдалося даведацца, што галоўным радзівілаўскім прэтэндэнтам на трыбунальскае маршалкоўства будзе мсціслаўскі кашталян Юзаф Шчыт, які мяркуе быць абраны дэпутатам на сойміку ў Мсціславе. Менавіта таму, Салагуб прасіў, каб Міхал Антоні Сапега знайшоў «каго моцнага», хто сарве мсціслаўскі соймік [5, p. 402 – 402v]. Пазней Салагубу ўдалося даведацца, што Радзівілы разглядаюць кандыдатамі на трыбунальскага маршалкоўства віцебскага кашталяна Станіслава Агінскага і полацкага кашталяна Валер'яна Жабу [5, p. 415v]. Сам падскарбі ВКЛ прадпрыняў крокі перашкодзіць яшчэ аднаму магчымаму радзівілаўскаму кандыдату на трыбунальскія пасады – пінскаму гродскаму старосце Уладзіславу Ельскаму. Ян Салагуб даслаў на пінскі соймік свайго прыхільніка Францкевіча са значнымі сродкамі, які павінен быў прымусіць адмовіцца старацца аб дэпутацтве Уладзіслава Ельскага і ўвогуле сарваць соймік [5, k. 411 – 411v]. Асабліва не разлічвалі на поспех Ельскага і Радзівілы. У выніку пасля доўгіх разваг Радзівілы схіліліся да кандыдатуры полацкага кашталяна Валер'яна Жабы. Правесці выбар Жабы Радзівілы запланавалі на экзулянцкіх сойміках. Падрыхтоўчыя працы ўзначаліў радзівілаўскі шляхецкі прыхільнік Станіслаў Лопат. Да Міхала Антонія Сапегі дайшлі чуткі, што Радзівілам нават удалося дамагчыся падтрымкі ўплывовага на экзулянцкіх сойміках інстыгатара ВКЛ Станіслава Буржыньскага. У такім выпадку Міхал Антоні Сапега лічыў за лепшае адмовіцца ад папярэдніх планаў кааліцыянтаў адносна экзулянцкіх соймікаў і не дапусціць выбара дэпутатам Буржыньскага [5, p. 418 – 418v]. Адначасова з экзулянцкімі соймікамі наваградскі ваявода Мікалай Фаўстын Радзівіл надаваў вялікую ўвагу выбару прыхільных дэпутатаў на наваградскім сойміку. У той жа час Ганна Радзівіл не бачыла перспектыў у гэтага сойміка, бо ведала, што на ім будуць прысутнічаць наваградскі ваявода Мікалай Фаўстын Радзівіл, лоўчы ВКЛ Міхал Антоні Сапега і вількаўскі староста Юры Феліцыян Сапега. Зразумела, што ў такой сітуацыі соймік будзе сарваны [10, k. 134]. Адначасова яна вельмі турбавалася аб астатніх грамнічных сойміках, а «найбольш гарадзенскім». Яна нават спецыяльна напісала да Міхала Вішнявецкага, каб ён сарваў гэты соймік [10, k. 124].

Міхал Антоні Сапега, калі даведаўся ад Ігната Агінскага аб планах Радзівілаў сарваць гарадзенскі соймік, то палічыў за лепшае, каб Масальскі стараўся стаць дэпутатам на жмудскім сойміку. На Жмудзі было две моцныя групоўкі: першая пад кіраўніцтвам падскарбія ВКЛ Яна Салагуба і, такім чынам, падтрымала б выбар Масальскага; другая пад кіраўніцтвам жмудскага кашталяна Юзафа Тышкевіча таксама была б вымушана падтрымаць выбар дэпутатам Масальскага, бо Салагуб у праціўным выпадку абяцаў сарваць элекцыйны соймік па выбару жмудскага старасты. Ім як раз і імкнуўся стаць Юзаф Тышкевіч [5, p. 410v – 411]. Масальскі аднак адмовіўся ад такой прапановы: «мсціслаўскі ваявода з Гародні вырашыў стаць дэпутатам, нягледзячы на ўсё, смела ідучы на рызыку» [5, p. 415v]. І Сапегі вымушаны былі распрацаваць небывалы план, каб забяспечыць выбар Міхала Масальскага дэпутатам. Сэнс яго заключаўся, каб у выпадку зрыву гарадзенскага сойміку, абраць мсціслаўскага ваяводу дэпутатам на ваўкавыскім сойміку: «У Ваўкавыску аж дапазна ўтрымлівалі паседжанні, і пачаўшы соймік пад прэтэкстам стрымлівання прэтэндэнтаў, а ў Гародні меў пачацца а восьмай гадзіне рана, і калі б там быў сарваны, растаўленымі коньмі, якія на шляху стаялі, меў збегчы да нас Ягомосць пан ваявода мсціслаўскі. Ужо тады суб'екты аж а чацвёртай гадзіне па палудню пачалі соймік у Ваўкавыску» [11, k. 269 – 270]. Запасны варыянт Масальскаму не спатрэбіўся. Масальскі разам з гарадзенскім падстоліям Антоніям Міцутай быў абраны дэпутатам у Гародні [5, p. 421; 12, apk. 73 – 74]. Паспяховы выбар Масальскага на гарадзенскім сойміку, як успамінае Юзаф Станіслаў Сапега, быў дасягнуты з дапамогай хітрасці: «стараннямі брата майго, які праціўную групоўку так спаіў, што тады спала, калі соймік адбыўся» [4, k. 339]. Сам Міхал Масальскі лічыў, што на гарадзенскім сойміку Міхал Антоні Сапега «вельмі яму дапамог» [6, p. 30]. І надалей Масальскі ў першую чаргу разлічваў на дапамогу Сапег і адразу пасля сойміка з просьбай падтрымкі да трыбунальскага маршалкоўства адазваўся да яшчэ аднаго сапежынскага лідэра надворнага падскарбія ВКЛ Юзафа Францішка Сапегі [13, k. 2]. Акрамя таго, дапамагло Масальскаму і Сапегам у Гродне тое, што з'езд удзельнікаў кааліцыі ў Шчучыне напачатку 1741 года даволі сур'ёзна напужаў мясцовых радзівілаўскіх пры-

хільнікаў на чале з польным стражнікам ВКЛ Лукашам Барановічам. Апошні адначасова даведаўся і аб сур'ёзнай хваробе свайго магнацкага патрона Міхала Вішнявецкага [5, р. 411v].

Сам жа гарадзенскі соймік адбыўся ў чатыры гадзіны раніцы і толькі потым пратэставалі пад'ехаўшыя радзівілаўскія прыхільнікі [10, k. 140; 14, k. 1 – 2]. Радзівілы лічылі выбар Масальскага нелегітымным і абвінавачвалі, што «Масальскі ваявода рана а чацвёртай гадзіне соймік украў і сябе дэпутатам зрабіў, шляхта, калі ў час на соймік прыехала, маніфеставала супраць таго» [10, k. 140]. Радзівілы, каб перашкодзіць Масальскаму, нават збіраліся прывезці пратэставаўшую гарадзенскую шляхту на рэасумпцыю Трыбунала ВКЛ. У такой сітуацыі Фамілія гатова была аказаць дапамогу Сапегам і пайсці на адкрыты канфлікт з Радзівіламі. Міхал Чартарыйскі лічыў, што калі Радзівілы будуць перашкаджаць трыбунальскаму маршалкоўству Масальскага, то неабходна ўсім кааліцыянтам з'ехацца з сваімі прыхільнікамі на рэасумпцыю Трыбунала ВКЛ, каб, як пад час рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ 1732 года, прымусіць Вішнявецкага і Радзівілаў да саступак. Чартарыйскі не спыніўся толькі на прапановах і адначасова ў падтрымку кандыдатуры Масальскага накіраваў лісты на каралеўскі двор. Згодна планам Чартарыйскага, Аўгуст III павінен быў напісаць да гетманаў ВКЛ у падтрымку кандыдатуры Міхала Масальскага на трыбунальскае маршалкоўства [8, р. 7].

Выбары на астатніх сойміках адбыліся ў барацьбе паміж сапежынскімі і радзівілаўскімі прыхільнікамі. Пад шматлікімі пратэстацыямі ў Вільне былі абраны прыхільнікі Радзівілаў: віленскі падваявода Мікалай Антоні Петрусевіч і Юры Абрамовіч. Таксама пад шматлікімі пратэстацыямі на смаленскім сойміку дэпутатамі былі абраны Кулеша з Кісаржэўскім. Старадубскі соймік быў «украдзены». Радзівілаўскія прыхільнікі правялі яго напярэдадні і на іншым месцы. Дэпутатамі на ім былі абраны старадубскі земскі пісар Рыгор Антоні Гімбут і радзівілаўскі кандыдат да трыбунальскага маршалкоўства полацкі кашталян Валер'ян Жаба [4, k. 338 – 339]. На наваградскім сойміку мясцовы ваявода Мікалай Фаўстын Радзівіл, не звяртаючы ўвагі на пратэсты, заняў пасаду дырэктара сойміка. Гэта справакавала шматлікія выступленні сапежынскіх прыхільнікаў пад кіраўніцтвам вількаўскага старасты Юрыя Феліцыяна Сапегі [10, k. 131, 134; 15, л. 1]. Вялікае значэнне мела стаўленне Міхала Чартарыйскага да апратэставаных дэпутатаў. Даведаўшыся аб выніках грамнічных соймікаў падканцлер ВКЛ Міхал Чартарыйскі пераканаўча заяўляў, што старадубскі і смаленскі соймікі не могуць прэтэндаваць на адбыўшыміся законна. Таксама і наваградскія дэпутаты абраны незаконна, а ім дарогу да прызнання трыбунальскімі суддзямі перакрые і выдадзены ў Трыбунале ВКЛ супраць іх дэкрэт. Адзіную незадаволенасць падканцлера ВКЛ вылікалі абраныя з пратэстамі віленскія дэпутаты, бо можна было пераканаць шляхту ад пратэстацыі супраць іх выбара. Калі моцна не зменяць сітуацыю вынікі «рускіх» соймікаў, то, на думку Чартарыйскага, кааліцыі быў нестрашны незаконны выбар Жабы на старадубскім сойміку [8, k. 7 – 7v].

Перад пагрозай магчымага маршалкоўства Масальскага Радзівілы прадпрынялі спробу ўвогуле прымірыцца з Сапегамі і распачаць з імі супрацоўніцтва. Пасля выплаты застаўшыхся грошай за правы Сапег на «нойбургскія ўладанні» Ганна Радзівіл запрасіла віленскага каад'ютара Юзафа Станіслава Сапегу да сябе ў Няхневічы. Мэтай была спроба дасягнуць згоды ў справе Сапегаў з бускімі старастамі Яблакостамі і перацягнуць на свой бок Юзафа Станіслава Сапегу. Той падчас перамоваў з Ганнай Радзівіл заўважыў, што тая «вельмі баялася, каб маршалкам не стаў мсціслаўскі ваявода і каб мы, трымаючыся з Чартарыйскімі, на Радзівілаў не паўсталі б» [4, k. 341]. Сапегі і Радзівілы, аднак, не гатовы былі саступаць у спрэчных пытаннях, асабліва наконт спадчыны па Казіміру Леону Сапезе, і перамовы скончыліся агульнымі дэкларацыямі. Ганна Радзівіл і Юзаф Станіслаў Сапега «рассталіся тады досыць палітычна», і абодва разумелі, што тая «злепленая дамова» нежыццяздольная [4, k. 341]. Фактычна перамовы паказалі, што галоўныя супярэчнасці былі не паміж Радзівіламі і Чартарыйскімі, а паміж Радзівіламі і Сапегамі, і надалей яны толькі павялічваліся.

Пасля смерці 2 сакавіка 1741 года любашаньскага старасты Леона Навасельскага. Удава Саламея Ганна абрала сабе апекунамі ў Трыбунале ВКЛ Радзівілаў. Міхал Антоні Сапега спрабаваў праз Юзафа Францішка Сапегу, каб тыя адмовіліся ад такой апекі, што дапамагло б пазбегнуць канфлікту паміж абодвума магнацкімі родамі [9, k. 193 – 194]. Аднак нават і ў гэтым пытанні не ўдалося дасягнуць згоды, што яшчэ больш абвастрала адносіны паміж Радзівіламі і Сапегамі і рабіла канфлікт непазбежным.

Перавага ў дадзены момант знаходзілася ў Сапег і іх кандыдата на трыбунальскае маршалкоўства Міхала Масальскага. Адзінай перашкодай яму да трыбунальскага маршалкоўства мог стаць віленскі ваявода і вялікі гетман ВКЛ Міхал Вішнявецкі. Адразу пасля сойміка Міхал Масальскі напісаў ліст з просьбай аб падтрымцы яго кандыдатуры на трыбунальскага маршалка да Міхала Вішнявецкага. Той даў папярэднюю згоду, але для яе канчатковага пацвярджэння Масальскаму ў канцы лютага 1741 года прыйшлося накіравацца да Слоніма на сустрэчу з вялікім гетманам ВКЛ [6, р. 18]. Туды Масальскі і прыбыў дзесьці ў канцы лютага – пачатку сакавіка 1741 года. Вішнявецкі пацвердзіў сваю ранейшую згоду, каб мсціслаўскі ваявода стаў трыбунальскім маршалкам, але пажадаў для вырашэння ўсіх спрэчных пытанняў прыезду Міхала Антонія Сапегі [6, р. 19, 20]. Падтрымалі Масальскага і прадстаўнікі іншых магнац-

кіх родаў. Асабліва карыснай была падтрымка лідэра магнацкага рода Агінскіх віцебскага ваяводы Марціна [6, p. 21, 23v].

Згодна просьбе Вішнявецкага лоўчы ВКЛ Міхал Антоні Сапега ў сакавіку 1741 года накіраваўся на перамовы. Вішнявецкі падчас сустрэчы ў Слоніме заявіў, што хоча, каб бускія старасты хутчэй распачалі перамовы з Сапегамі. Падыходзячым месцам была рэасумпцыя Трыбунала ВКЛ, і таму Вішнявецкі імкнуўся хутчэй накіраваць бускіх старастаў у Вільню [5, p. 466v]. Лічыў, што «віленскае пяро» павінна дастацца віленскім дэпутатам, бо супраць іх выбара былі занесены няслушныя пратэстацыі. Калі ж недапускаць у трыбунальскае кола дэпутатаў з-за няслушных пратэстацый, то і Трыбунал ВКЛ не адбудзецца з-за малай лічбы суддзяў [5, p. 464v]. Потым Вішнявецкі не ўтрымаўся і абвінаваціў, што Сапега, Салагуб і Масальскі хочуць, каб Трыбунал ВКЛ увогуле не адбыўся. Тады яны замест Трыбунала ВКЛ створаць канфедэрацыю супраць гегемоніі гетманаў, як у «часы Алькенік». Вішнявецкі заяўляў, што «чакайце маёй смерці», бо пакуль жывы, то ваша выступленне «ў пачатку ў чатыры тыдні магу прытлуміць». Сапега адмаўляўся ад існавання ў кааліцыі такіх планаў, але Вішнявецкі не хацеў яго нават слухаць. Яго жонка Тэкля паведаміла лоўчаму ВКЛ, што гэта не выдумкі самога Вішнявецкага, а інфармацыю аб канфедэрацыі ён атрымаў з газет, дасланых з каралеўскага двара. Яна пераканала Сапегу, што Міхал Вішнявецкі перадумае і сам будзе жалець, што зараз пагражаў [5, p. 465]. Самому Міхалу Антонію Сапезе ўдалося даведацца, што насамрэч гэта радзівілаўскі прыхільнік Станіслаў Лопат распаўсюджваў чуткі, што кааліцыя хоча стварыць канфедэрацыі і ў адсутнасць Аўгуста III зрабіць каралём Станіслава Ляшчынскага [5, p. 466v].

Лоўчаму ВКЛ удалося даведацца ад свайго прыхільніка, які быў даверанай асобай і ў вялікага гетмана ВКЛ, што сваім прыхільнікам Вішнявецкі ўжо заявіў, што дась магчымасць Масальскаму стаць трыбунальскім маршалкам пры двух умовах: па-першае, каб Сапегі пагадзіліся і падтрымалі кандыдатуру полацкага кашталяна Валер'яна Жабу на маршалка наступнага Трыбунала ВКЛ; па-другое, каб віленскае пяро дасталася віленскім дэпутатам і ўвогуле былі дапушчаны ў лік суддзяў усе дэпутаты, супраць якіх былі пададзены пратэсты [5, p. 466].

Ужо ў сярэдзіне сакавіка 1741 года ў Слоніме Міхал Антоні Сапега сустрэўся з усімі лідэрамі магнацкай групоўкі Радзівілаў: Міхалам Вішнявецкім, Міхалам Казімірам і Мікалаем Фаўстынам Радзівіламі. Апошнія хацелі атрымаць адказ Сапегі, што рабіць з сарванымі і апратэставанымі соймікамі, бо калі ўсе прызнаць за неадбыўшыяся, то і Трыбунал ВКЛ не адбудзецца з-за малой лічбы дэпутатаў. Міхал Антоні Сапега прапанаваў, каб прызнаць за сарваныя соймікі тыя, дзе шляхта пратэставала супраць парушэння правоў правядзення соймікаў, а таксама там, дзе былі сарваны пры выбары дырэктара сойміка, бо ў адваротным выпадку і надалей пачалі з'яўляцца б соймікі без выбараў дырэктара. У той жа час раіў з дапамогай угавораў і кансэнсуса дамовіцца аб прызнанні легітымнымі соймікаў, дзе пратэсты былі занесены супраць саміх дэпутатаў [5, p. 423 – 423v]. Акрамя таго, як зразумеў лоўчы ВКЛ, Радзівілы хочуць, каб у трыбунальскае кола ўвайшлі абраныя з пратэстамі мінскія і віленскія дэпутаты. Патрэбна гэта было для таго, каб яны сталі адпаведна пісарамі літоўскай і рускай кадэнцыі [5, p. 424v].

Падчас сустрэчы нечакана Міхал Казімір Радзівіл звярнуўся да Міхала Антонія Сапегі з прапановай як мага хутчэй заключыць дамову з бускай старасцянкай. Па яго словах, Радзівілы лічаць прэтэнзіі бускага старасты Юзафа Ябланоўскага звыш меры і таму не падтрымаюць іх. Гэта азначала, што Сапегі маюць магчымасць хутка заключыць дамову з бускай старасцянкай Каралінай. Пагаджаўся Радзівіл з тым, што сапежынская прапанова ў Варшаве аб выплаце 300 тысяч злотых можа стаць асновай будучай дамовы. Прычыну зрыву перамоў на такіх умовах у Варшаве тлумачыў тым, што ён разам з канцлерам ВКЛ Янам Фрэдэрыкам Сапегай не хацелі, каб гарантамі дамовы былі Чартарыйскія і сандамірскі ваявода Ян Тарло. Магчыма, што Радзівілы бачылі ў такіх пасрэдніках узмацненне небяспечнага для іх супрацоўніцтва паміж Сапегамі і Чартарыйскімі, а таксама Сапегамі і Тарламі. У выніку вырашылі, што буская старасцянка прыедзе на перамовы з Сапегамі да Волпы ці Вільна. Згода ў гэтым пытанні дала дазвол Радзівілаў на тое, каб будучым трыбунальскім маршалкам стаў Міхал Масальскі [5, p. 424 – 424v]. Адначасова Радзівілы абяцалі, што не будуць падтрымліваць любашаньскую старасцянку Саламею Ганну супраць Сапег [5, p. 424v – 425]. Міхал Вішнявецкі ўвогуле выказваў вялікую незадаволенасць з новага вяселля Караліны і прасіў Сапегу абараніць правы малалетніх Аляксандра і Міхала Ксаверыя [5, p. 425]. Такім чынам, падчас сустрэчы стала зразумела, што гетманы ВКЛ настроены як мага хутчэй скончыць справу спадчыны па Казіміру Леону Сапезе на ўзгодненых раней у Варшаве ўмовах і не хочуць падтрымліваць у Трыбунале ВКЛ новыя патрабаванні бускіх старастаў. Рэальным станавілася сканчэнне радзівілаўска-сапежынскага супрацьстаяння ў Трыбунале.

Абяцанні Сапегі скончыць перамовамі справу з бускімі старастамі і што Трыбунал ВКЛ не будзе ператвораны ў канфедэрацыю, як выдае, пераканалі гетманаў ВКЛ. Пасля ад'езду Міхала Антонія Сапегі з Слоніма Міхал Вішнявецкі і Міхал Казімір Радзівіл накіравалі новыя лісты да Міхала Масальскага. У іх яны заяўлялі аб сваёй падтрымцы кандыдатуры Масальскага на трыбунальскае маршалкоўства [6, p. 27]. Магчыма, што яны ў гэты час атрымалі і пацвярджэнне аб каралеўскай падтрымцы кандыдатуры Міхала

Масальскага на трыбунальскае маршалкоўства. Ва ўсякім выпадку, Юзафу Францішку Сапезе аб сваім побыце ў сакавіку 1741 года ў Міхала Вішнявецкага лоўчы ВКЛ перадаваў, што Радзівілы будуць чакаць пацвярджэнне ад каралеўскага двара аб падтрымцы кандыдатуры Масальскага на трыбунальскае маршалкоўства, бо на дадзены момант мелі іншыя дворскія прапановы аб Трыбунале ВКЛ [9, k.192 – 193].

Канцлер ВКЛ Ян Фрэдэрык Сапега не супрацоўнічаў са сваімі родзічамі Радзівіламі. Ён увогуле адкрыта стаў на бок чарэйскіх Сапег і адразу па сойміках падтрымаў на трыбунальскае маршалкоўства кандыдатуру Міхала Масальскага [5, p. 462]. Больш таго, у сваім лісце да Юзафа Станіслава Сапегі ад 29 сакавіка 1741 года заявіў аб поўнай падтрымцы планаў яго і Міхала Антонія Сапегі адносна Трыбунала ВКЛ [5, p. 500]. Канцлер ВКЛ раіў напісаць на каралеўскі двор, што Міхал Масальскі дакладна стане трыбунальскім маршалкам, бо на яго кандыдатуру пагадзіўся і вялікі гетман ВКЛ, а польны гетман ВКЛ абяцаў нават дапамагаць [5, p. 500]. Адначасова Ян Фрэдэрык Сапега прасіў іншых Сапег падтрымаць на ўрад рускага пісара кандыдатуру віцебскага земскага пісара Казіміра Гурко [5, p. 508v]. З такімі ж просьбамі ён звярнуўся і да сваіх родзічаў Радзівілаў [16, k. 68].

Выдае, што ў гэты час канцлер ВКЛ быў хутчэй саюзнікам Сапег, а не Радзівілаў. Істотная розніца ў яго пазіцыі ад пазіцыі Сапег заключалася ў тым, што ён не пагаджаўся на супрацоўніцтва Сапег з варожымі для яго Чартарыйскімі. Самастойна ад Чартарыйскіх шукаў ён для Сапег і падтрымкі на каралеўскім двары. Так у пачатку красавіка 1741 года Ян Фрэдэрык Сапега раіў прасіць дапамогі ў атрыманні ўрада рэферэндарыя ВКЛ для Юрыя Феліцыяна Сапегі ў ксяндза Гварыні і кароннага падканцлера Яна Малахоўскага. Меркаваў, што Радзівілы падтрымаюць кандыдатуры падканюшага ВКЛ Міхала Слізня і браслаўскага падкаморыя Антонія Рудаміны. Чартарыйскія падтрымаюць кандыдатуры харужыца ВКЛ Станіслава Чартарыйскага, мазырскага гродскага старасты Людвіка Гервазія Аскеркі, віленскага падчашага Яна Гараіна, Сымона Сіруця і інш. [5, p. 507 – 507v].

У адрозненне ад прыхільнага стаўлення Міхала Вішнявецкага, Міхала Казіміра Радзівіла і Яна Фрэдэрыка Сапегі, Мікалай Фаўстын Радзівіл паказваў сваё непрыхільнае стаўленне да Сапег. Ён не хацеў дапусціць у лік трыбунальскіх суддзяў Міхала Масальскага. Міхалу Антонію Сапезе нават удалося пабачыць гарадзенскую шляхту, якая прыехала падпісаць пратэстацыю. Сваім з’яўленнем і прамовай яму ўдалося прывесці яе ў вялікае замяшальніцтва [5, p. 423v]. Навагрудскі ваявода Мікалай Фаўстын Радзівіл не збіраўся адступаць і хацеў прывезці ў Вільню «колькі дзесяткаў шляхты, якая жадала кампенсіраваць, што праспала соймік і ўзятую на яго зрыў ўзнагароду» [11, k. 289 – 290]. Не было і ўпэўненасці, што вялікі і польны гетманы ВКЛ паступяць згодна сваім абяцанням і не будуць перашкаджаць Масальскаму. Асабліва важнай заставалася пазіцыя Вішнявецкага, які як віленскі ваявода, мог непасрэдна ўплываць на допуск дэпутатаў у лік суддзяў падчас рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ.

Падчас побыту лоўчага ВКЛ у Слоніме да Вішнявецкага прыбылі паслы ад ашмянскага павета, якія сярод іншага прасілі падтрымаць ашмянскіх дэпутатаў на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ. Вялікі гетман ВКЛ адмовіўся ад канкрэтнай дэкларацыі і толькі паабяцаў паступаць згодна праву [5, p. 464 – 464v]. Нам невядома стаўленне да ашмянскіх дэпутатаў Міхала Антонія Сапегі. Цікава, што адначасова Барбара Радзівіл пераконвала Міхала Казіміра Радзівіла прасіць пісара ВКЛ Тадэвуша Агінскага адмовіцца ад пратэстацыі супраць ашмянскага сойміка, бо была ўпэўнена ў прыхільнасці мясцовых дэпутатаў [7, k. 98 – 99]. У той жа час у Слоніме было і некалькі прыемных назіранняў для ўдзельнікаў магнацкай кааліцыі. Так, Міхал Антоні Сапега быў вельмі задаволены, калі пабачыў у Слоніме, што Міхал Вішнявецкі хутчэй заўсё з-за хваробы не здолее быць на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ [5, p. 424v]. Такія ж звесткі меў і іншы кааліцыянт Міхал Масальскі. Менавіта таму Масальскі прасіў Сапег старацца аб прыхільніках у віленскім гродзе [6, p. 23 – 23v]. Хвароба Вішнявецкага, наадварот, змяшала шэрагі радзівілаўскіх прыхільнікаў. Ганна Радзівіл вельмі апасалася, што магчымая адсутнасць з-за хваробы Міхала Вішнявецкага на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ дасць магчымасць Сапегам зноў перайсці ў наступ у справе з бускімі старастамі [10, p. 152]. Тым больш што Сапегі ведалі, што і польны гетман ВКЛ Міхал Казімір Радзівіл не будзе на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ, бо спяшаецца ў Люблін, дзе будзе ў Каронным Трыбунале разглядацца яго справа спадчыны па Сабескіх з сандамірскім ваяводай Янам Тарло [5, p. 425 – 425v]. Такім чынам, рэасумпцыя Трыбунала ВКЛ магла прайсці без абодвух гетманаў ВКЛ, што фактычна азначала поўную перавагу на ёй Сапег і іх саюзнікаў.

Акрамя выбара трыбунальскім маршалкам Масальскага вялікую ўвагу надавалі Сапегі захаванню прытэстацый супраць соймікаў, дзе былі абраны па два варожых дэпутата. Так, пратэстацыі супраць навагрудскага сойміка ўтрымліваў Юры Феліцыян Сапега. Ён імкнуўся, каб нават смаленскі кашталян Казімір Несялоўскі застаўся сярод пратэставаўшай шляхты і праводзіў з ім у гэтай справе перамовы праз свайго прыхільніка Візгерда. Лічыў, што шляхціцы Кунцэвічы будуць заставацца сярод пратэставаўшай шляхты, бо выканаюць любы загад Міхала Антонія Сапегі. Абяцаў са сваімі прыхільнікамі падтрымліваць пратэстацыі і ўплывовы ў навагрудскім ваяводстве шляхціц Вайніловіч. Падтрымку абяцаў і Ігнат Корсак [5, p. 474 – 475]. Пасля доўгіх разваг наконт упіцкага сойміка Міхал Антоні Сапега не пагадзіўся

на ўгаворы і вырашыў захаваць пратэстацыю супраць выбару ўпіцкіх дэпутатаў. На думку лоўчага ВКЛ, абодва ўпіцкія дэпутаты будуць галасаваць супраць выбару Масальскага трыбунальскім маршалкам. Акрамя таго, лічыў, што патрэбна большая перавага сапежынскіх прыхільнікаў у судовым коле, бо няма ўпэўненасці, што ўдасца скончыць кампрамісам справу з бускай старасцянкай. Менавіта таму лічыў, што трэба прывесці на рэасумпцыю Трыбунала ВКЛ пратэставаўшую супраць упіцкага сойміка шляхту [5, p. 427 – 427v]. Напэўна, ён меў рацыю не дапускаць у лік суддзяў упіцкіх дэпутатў, бо Ганна Радзівіл нават прасіла віленскага біскупа Зянковіча, каб ён падтрымаў аднаго з упіцкіх дэпутатаў упіцкага скарбніка Сташэўскага ў яго старанні аб пісарстве рускай кадэнцыі, а калі б гэта не ўдалося, то дапамог стаць трыбунальскім падскарбіям [10, k. 157]. Зразумела, што на такія трыбунальскія ўрады Ганна Радзівіл магла рэкамендаваць толькі вельмі адданага Радзівілам шляхціца. Саюзнік Сапег Міхал Чартарыйскі ўжо 25 сакавіка 1741 года быў перакананы, што ніхто не перашкодзіць Масальскаму стаць маршалкам Трыбунала ВКЛ. Прычынай яго ўпэўненасці было тое, што каралеўскі двор ужо пісьмова выказаўся на карысць кандыдатуры Масальскага, а вусна такую падтрымку павінен быў перадаць генерал артылерыі ВКЛ Юрыя Флемінга, які быў спецыяльна пасланы каралём на рэасумпцыю Трыбунала ВКЛ. Больш увагі, на думку Чартарыйскага, патрэбна было звяртаць, каб не былі дапушчаны ў трыбунальскае кола незаконна абраныя наваградскія і мінскія дэпутаты [8, p. 9]. Як можна меркаваць, такая ўвага да іх была выклікана тым, што яны маглі прэтэндаваць на ўрад пісара рускай кадэнцыі.

Увогуле пратэстацыі былі пададзены супраць большасці грамнічых соймікаў [17, s. 188 – 191]. У такой сітуацыі рэасумпцыя Трыбунала ВКЛ прайшла ў вострым супрацьстаянні паміж Радзівіламі і магнацкай кааліцыяй. Аб ходзе рэасумпцыі захавалася добрае апісанне ў дыярыюшы Юзафа Станіслава Сапегі. Згодна ёй Міхал Вішнявецкі, прыбыўшы ў Вільню, адразу распачаў з Сапегамі перамовы аб складзе будучага Трыбунала ВКЛ праз віцебскага ваяводу Марціна Агінскага і абознага ВКЛ Ігната Агінскага, якія падтрымлівалі кандыдатуру Масальскага «досыць палітычна» [4, k. 343]. Вішнявецкі заявіў, што дае згоду, каб Масальскі быў абраны трыбунальскім маршалкам. Адпаведна, пагадзіўся не падтрымліваць кандыдатуру Валер'яна Жабы. Зразумела, што таму і не настойваў на допуску ў лік трыбунальскіх суддзяў старадубскіх дэпутатаў (адзін з якіх і быў Жаба). Аднак Вішнявецкі патрабаваў, каб у лік суддзяў увайшлі віленскія, наваградскія і смаленскія дэпутаты, супраць выбараў якіх былі занесены шматлікія пратэстацыі [4, k. 343]. Сапегі заявілі, што супраць выбару Масальскага дэпутатам няма ніякіх пратэстацый. Падтрымаў яго кандыдатуру і каралеўскі двор, аб чым паведаміў і Вішнявецкаму. Таму і той не зможа перашкодзіць Масальскаму. Пагадзіліся Сапегі дапусціць віленскіх дэпутатаў і аддаць віленскае пяро аднаму з іх, Петрусевічу. Аднак заявілі, што не дапусцяць у лік суддзяў наваградскіх дэпутатаў і не аддадуць рускага пісарства, на якое тыя прэтэндавалі, таксама не дапусцяць і смаленскіх дэпутатаў. Раз'юшаны такім адказам Вішнявецкі праз Агінскіх заявіў, што сам як віленскі ваявода без згоды іншых дапусціць смаленскіх і наваградскіх дэпутатаў у лік трыбунальскіх суддзяў, а Масальскаму не дасць быць абраным трыбунальскім маршалкам [4, k. 343 – 344]. У такой сітуацыі паміж Сапегамі распачаліся нарады аб магчымым адказе на такія дзеянні Вішнявецкага. Разглядаліся варыянты пратэставаць супраць прысутнасці гетмана ВКЛ Міхала Вішнявецкага на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ, увядзення вайсковых аддзелаў у Вільню і яго дзейнасці супраць вольных шляхецкіх пратэстацый. Надалей меркавалася падаць пратэстацыю Вішнявецкаму і паехаць да караля. Разглядаўся і варыянт, калі Сапегі і іх саюзнікі, узброеныя, разам з шляхтай павінны былі стаць супраць Вішнявецкага ў судовай ізбе. Такія нарады вылікалі падзел унутры магнацкай кааліцыі. Віцебскі ваявода Марцін Агінскі, абозны ВКЛ Ігнат Агінскі, пісар ВКЛ Антоні Пшаздецкі і нават падскарбі ВКЛ Ян Салагуб не пагаджаліся не толькі на пратэстацыю супраць Вішнявецкага, але і на астатнія дзеянні супраць вялікага гетмана ВКЛ. У той жа час лоўчы ВКЛ Міхал Антоні Сапега, віленскі каад'ютар Юзаф Станіслаў Сапега, мсціслаўскі ваявода Міхал Масальскі і нават віцебскі кашталян Станіслаў Агінскі былі гатовы на актыўнае супрацьдзеянне Вішнявецкаму і пераконвалі на сваю карысць астатніх [4, k. 344].

У гэты вырашальны момант ад каралеўскага двара прыбыў генерал артылерыі ВКЛ Юры Флемінг. Даведаўшыся аб сітуацыі, якая склалася, ён накіраваўся да Вішнявецкага, каб пераканаць яго пайсці на саступкі. Перадаў яму каралеўскі ліст адносна Трыбунала ВКЛ з падтрымкай Масальскага на ўрад трыбунальскага маршалка. У такой сітуацыі Вішнявецкі быў вымушаны саступіць і адмовіцца ад ужывання сілы. Ён толькі пераконваў пратэставаўшую наваградскую шляхту адмовіцца ад пратэстацыі супраць мясцовага сойміка. Міхал Вішнявецкі і Мікалай Фаустын Радзівіл абяцалі, што калі наваградскія дэпутаты будуць дапушчаны ў лік суддзяў, то не будуць прэтэндаваць на рускае пяро, якое тады дастанецца віцебскаму дэпутату і віцебскаму земскаму пісару Казіміру Гурко [4, k. 345]. Вішнявецкі адначасова ўгаворваў і Сапег, каб яны не падтрымлівалі пратэставаўшую наваградскую шляхту. Тыя пабачыўшы, што Вішнявецкі не саступіць, пасля доўгіх перамоў пагадзіліся на допуск наваградскіх дэпутатаў. Затое адначасова было прызнана, што пратэстацыя супраць выбару дэпутатам на гарадзенскім сойміку Міхала Масальскага была фальсіфікавана [4, k. 344 – 345]. У выніку абодва наваградскіх дэпутаты Сымон Міхал Данэйка і

Францішак Магільніцкі былі дапушчаны ў лік трыбунальскіх суддзяў. Мікалай Фаўстын Радзівіл спрабаваў за адно дапусціць у лік суддзяў смаленскіх дэпутатаў, не звяртаючы ўвагі на шматлікія пратэстацыі супраць іх выбару. Супраць актыўна выступіў Міхал Антоні Сапега, які заявіў, што не дапусціць іх насуперак праву. Яго моцны пратэст пераканаў Вішнявецкага і ён пагадзіўся не дапускаць смаленскіх дэпутатаў у лік трыбунальскіх суддзяў [4, k. 345 – 346]. Радзівілы, парушаючы ранейшыя дамоўленасці, паспрабавалі правесці выбар пісарам рускай кадэнцыі наваградскага дэпутата Францішка Магільніцкага. Узнікненню новага канфлікту перашкодзіў Флемінг, які напомніў Вішнявецкаму, што той абяцаў рускае пяро віцебскаму дэпутату Казіміру Гурко, а не камусьці з наваградскіх дэпутатаў. Гурко ў выніку і стаў пісарам рускай кадэнцыі нягледзячы на тое, што Барбара Радзівіл і Тэкля Вішнявецкая да апошняга ўпарта падтрымлівалі кандыдатуру Магільніцкага [4, k. 346].

Міхал Вішнявецкі не толькі пагадзіўся на размеркаванне трыбунальскіх урадаў, але і абяцаў не падтрымліваць бускіх старастаў Ябланоўскіх супраць Сапег. Даволі хутка прадставілася магчымасць пераканацца, што Вішнявецкі не падманваў. Яго абяцанні пацвердзіліся, калі падскарбі ВКЛ выконваў рашэнне Трыбунала ВКЛ і яго адміністратары занялі ракацішскае і лаварышскае староствы бускіх старастаў, якія былі ўсяго ў некалькіх кіламетрах ад месца побыту Вішнявецкага. Той не зрабіў ніякіх спробаў перашкодзіць [4, k. 345 – 346]. Яшчэ далей пайшоў іншы лідэр Радзівілаў Ян Фрэдэрык Сапега, які павіншаваў Сапег з удалай рэасумпцыяй Трыбунала ВКЛ і раіў падтрымліваць жаданні каралеўскага двара. Адначасова канцлер ВКЛ асабліва падкрэсліваў сваім родзічам Радзівілам, што адбыўшымся размеркаваннем трыбунальскіх пасад вельмі будуць задаволены на каралеўскім двары [5, p. 509; 16, k. 73].

У чэрвені 1741 года стала зразумела, што Радзівілы, нягледзячы на ўсе свае абяцанні, падтрымліваюць бускіх старастаў супраць Сапег. Ганна Радзівіл і Тэкля Вішнявецкая нават спрабавалі перацягнуць на свой бок трыбунальскага маршалка Масальскага. Адначасова Ганна Радзівіл абяцала Юзафу Станіславу Сапезе, што бускія старасты гатовы пайсці на перамовы, але насамрэч хацела зацягнуць час. Віленскі каад'ютар гэта добра разумеў і дамогся скарэйшага разгляду справы ў Трыбунале ВКЛ [4, k. 349 – 350]. Бускія старасты «сыпалі грашыма, на саміх дэпутатаў колькі дзесяткаў тысяч выдаўшы» Тым жа шляхам вымушаны быў пайсці і віленскі каад'ютар. Разгляд справы цягнуўся шэсць тыдняў. У выніку ў сярэдзіне жніўня 1741 года перамогу атрымалі Сапегі [4, k. 350 – 351]. Так адбылося дзякуючы значнай дапамозе трыбунальскага маршалка Міхала Масальскага і падскарбія ВКЛ Яна Салагуба. Апошні зноў актыўна падтрымаў Сапег пасля таго, як радзівілаўскія атрады насуперак ранейшым абяцанням выгналі яго службоўцаў з Лаварышак і Ракацішак [4, k. 351]. Падскарбі ВКЛ Ян Салагуб абяцаў падтрымліваць сапежынскія справы, як «свае ўласныя». Больш таго, ён напісаў да Міхала Чартарыйскага з просьбай інфармаваць праз Міхала Антонія Сапегу пра дзеянні Радзівілаў, каб паспяваць прадпрыняць дзеянні ў адказ [5, p. 429v – 430].

Самі Радзівілы ўсё больш і больш пагружаліся ва ўсемагчымыя судовыя справы. У канцы траўня 1741 года пагоршылася сітуацыя Міхала Казіміра Радзівіла ў Кароне, бо Ян Тарло высоўваў усё новыя і новыя прэтэнзіі, што азначала далейшае распальванне канфлікту аб уладаннях… [18, k. 36].

Не садзейнічаў моцы магнацкай групоўкі Радзівілаў і працягваўшыйся канфлікт паміж нясвіжскімі Радзівіламі і наваградскім ваяводай Мікалаем Фаўстынам Радзівілам. Апошні не спыніўся на атрыманні адшкадавання за свае правы на «нойбургскія ўладанні» і распачаў справу аб Беліцы, якую нядаўна трымаў у заставе. Атрымаўшы патрэбнае судовае рашэнне Мікалай Фаўстын Раддзівіл нават меркаваў захапіць Беліцу і толькі зварот Ганны Радзівіл аб дапамозе да падскарбія ВКЛ даў магчымасць пазбегнуць гэтага [10, k. 164]. І надалей Ганна Радзівіл апасалася, што Мікалай Фаўстын Радзівіл не дась магчымасці выкупіць з заставы Беліцу [10, k. 171]. Тое ўладанне вельмі падабалася і падскарбію ВКЛ, які яго абараняў, і Ганне Радзівіл ужо прыйшлося думаць, каб яно не засталося ў Салагуба. Яна палічыла за лепшае аддаць яго на тры гады ў заставу наваградскай ваевадзянцы Барбары Радзівіл, бо тая, «што хоча, тое ў мужа і вырабіць» [10, k. 177]. Сама Ганна Радзівіл бачыла прычынай складанай сітуацыі вакол Беліцы здраду свайго прадстаўніка Чарнецкага, які, на яе думку, спецыяльна дзейнічаў пры дамове з Сапегамі на карысць апошніх і іх саюзнікаў. У выніку Ганна Радзівіл была вымушана шукаць сродкі, каб выкупіць з заставы Беліцу [10, k. 183]. Ганна Радзівіл злавалася і на іншага свайго прадстаўніка Магільніцкага, які пацвердзіў Сапегам, што сорак тысяч злотых, уключаных у рахунак па выплаце «нойбургскіх грошай», ніколі не выплачваліся [19, k. 18].

Усе гэтыя справы не былі напрамую звязаны з Сапегамі, але неслі для Радзівілаў небяспеку пры магчымым разглядзе ў прыхільным Сапегам Трыбунале ВКЛ. Галоўнай судовай справай паміж Радзівіламі і Сапегамі заставалася пытанне спадчыны па Казіміру Леону Сапезе. Сапегі атрымалі судовае рашэнне на сваю карысць на віленскай кадэнцыі Трыбунала ВКЛ. Трыбунальскія рашэнні выклікалі вялікую незадаволенасць сярод Радзівілаў. У сярэдзіне жніўня 1741 года Ганна Радзівіл жалілася сыну Міхалу Казіміру Радзівілу, што яго сястра Караліна нясе значныя маёмасныя страты ў выніку разгляду яе справы з Сапегамі ў Трыбунале ВКЛ [10, k. 198]. Таксама жалілася на рашэнні Трыбунала ВКЛ і канцлеру ВКЛ Яну Фрэдэрыку Сапезе і прасіла дапамогі ў атрыманні старостваў па Казіміру Леону Сапезе, бо справа наконт старостваў

павінна была вырашыцца на каралеўскім двары і ў асэсарскім судзе, якім як раз і кіраваў канцлер ВКЛ [19, k. 10 – 11]. Такое стаўленне Радзівілаў паказвала, што барацьба яшчэ няскончана і працягнецца ў наступных Трыбуналах ВКЛ.

**Заключэнне.** Кааліцыі Сапег, Чартарыйскіх, Масальскіх і Салагубаў удалося перамагчы Радзівілаў у барацьбе за кантроль над Трыбуналам ВКЛ 1741 года. Гэта дало магчымасць Сапегам атрымаць неабходныя рашэнні ў судовых справах супраць Радзівілаў. У барацьбе за Трыбунал ВКЛ 1741 года вагі схіліліся на карысць Сапег толькі пасля таго, як па просьбе Фамілії ў іх падтрымку выказаўся каралеўскі двор. Чартарыйскім гэта дало магчымасць перашкодзіць усталяванню дамінавання Радзівілаў ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ і ўмацаваць антырадзівілаўскую магнацкую кааліцыю. Гэтая перамога кааліцыі родаў Чартарыйскіх, Сапег, Салагубаў і Масальскіх перашкодзіла ўсталяванню дамінавання магнацкай групоўкі Радзівілаў ва ўнутрыпалітычным жыцці Вялікага княства Літоўскага.

ЛІТАРАТУРА

1. Zielińska, T. Więź rodowa domu Radziwiłłowskiego w świetle diariusza Michała Kazimierza Radziwiłła «Rybieńki» / T. Zielińska // Miscellanea Historico-Archivistica. – 1989. – T. 3. – S. 175 – 190.
2. Zielińska, Z. Walka «Familii» o reforme Rzeczypospolitej, 1743 – 1752 / Z. Zielińska. – Warszawa: PWN, 1983. – 385 s.
3. Poniatowski, S.A. Pamiętniki / S.A.Poniatowski . – Warszawa, 1994. – 250 s.
4. Biblioteka Narodowa. Biblioteka Ordynacji Zamoyskich. Sygn. 941.
5. Lietuvos Mokslų Akademijos biblioteka. – F. 139. – B. 4061.
6. Lietuvos Mokslų Akademijos biblioteka. – F. 139. – B. 2711.
7. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Teka 47. – Koperta 638.
8. Lietuvos Mokslų Akademijos biblioteka. – F.139. – B. 4982.
9. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Roskie. – T.II. Korespondencja. – Sygn. LVI/7.
10. Archiwum Główne Akt Dawnych, Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Teka 45. – Koperta 628.
11. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Roskie. – T.II Korespondencja. – Sygn. LIII/14.
12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Фонд 1711. – Воп. 1. – Спр. 30. Гарадзенскі гродскі суд.
13. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Roskie. – T.II. Korespondencja. – Sygn. LIII/46.
14. Archiwum Główne Akt Dawnych, Archiwum Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 2588.
15. Российский государственный архив древних актов. – Фонд. 1463. – Оп. 1. – Дело 1082.
16. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. V. – Sygn. 13831. – Cz. 7.
17. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697 – 1794): Spis / pod red. Andrzeja Rachuby. – Warszawa: DiG, 2004. – 448 s.
18. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Teka 30. – Koperta 416.
19. Archiwum Główne Akt Dawnych. Archiwum Radziwiłłów. – Dz. IV. – Teka 45. – Koperta 629.

*Пастуніў 09.02.2009*